УДК 94(476)“1931/1939”:63-053.81

***В.В. Даніловіч***

*канд. гіст. навук, дац., дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

# МОЛАДЗЬ У СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ БССР У 1930-я гг.

*Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы ўдзелу моладзі ў сельскагаспадарчай вытворчасці Савецкай Беларусі ў 30-я гг. XX ст. Сцярджаецца, што юнацтва з'яўлялася важнай апорай у развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці БССР, непасрэдна ўдзельнічала ў мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі рэспублікі. Разам з тым у пачатку 1930-х гг. пашырэнне адмоўнага стаўлення ў грамадстве да палітыкі калектывізацыі знайшло адлюстраванне і ў камсамоле БССР. Агульны яго ўдзел у калектывізацыі і арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў лічыўся нездавальняючым. Значная колькасць камсамольскіх арганізацый абмяжоўвалася правядзеннем толькі агракультурных мерапрыемстваў. Аднак, нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці, уплыў камсамола ў калгасах, саўгасах, машынна-трактарных станцыях і майстэрнях рэспублікі паступова пашыраўся, дзякуючы мэтанакіраванай палітыцы ўлад. Новай формай удзелу юнакоў і дзяўчат ва ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці стала арганізацыя па ініцыятыве камсамола рэспублікі пры яго камітэтах маладзёжных сельскагаспадарчых станцый. Але і напрыканцы 1930-х гг. сялянская моладзь БССР не была цалкам ахоплена калгасамі. У рэспубліцы нават меліся гаспадаркі маладых сялян-аднаасобнікаў.*

## Уводзіны

Як вядома, у разглядаемы перыяд большасць насельніцтва БССР, у тым ліку юнакоў і дзяўчат, пражывала ў сельскай мясцовасці. Юнацтва было задзейнічана фактычна на ўсіх узроўнях селькагаспадарчай вытворчасці рэспублікі. Зразумела, гэту моладзь самым непасрэдным чынам закраналі любыя сацыяльна-эканамічныя змены, якія адбываліся ў сельскай гаспадарцы, а ў 1930-я гг. яны непарыўна былі звязаны з далейшым пашырэннем калектывізацыі.

У пачатку 1930-х гг. на тэрыторыі БССР з мэтай харчовага самазабеспячэння вайсковых частак пачалі арганізоўвацца чырвонаармейскія калгасы. Як правіла, яны ствараліся ў памежных раёнах з ліку дэмабілізаваных чырвонаармейцаў 1908 г. нараджэння, якія засталіся на звыштэрміновую службу. Акрамя таго дазвалялася прыцягваць прызыўнікоў 1931 г. з датэрміновым звальненнем у доўгатэрміновы адпачынак. Адбор іх ажыццяўляўся з ліку добрасумленных калгаснікаў, гаспадаркі якіх знаходзіліся на нязручных землях і ва ўмовах малазямелля. Чырвонаармейскія калгасы імкнуліся цесна ўзаемадзейнічаць з мясцовымі выканаўчымі органамі. Аднак апошнія з-за адсутнасці рэсурсаў часта не аказвалі ім дапамогі або рабілі гэта па астатковым прынцыпе. З 1933 г. вайсковыя часткі ў рэспубліцы на сталай аснове пачалі аказваць дапамогу ва ўборцы ўраджаю не толькі чырвонаармейскім калгасам, але і звычайным. Прычым, як правіла, сіламі навабранцаў [1, с. 89–91]. Як бачым, чырвонаармейскія калгасы ўтвараліся пры актыўным удзеле юнацтва з ліку ваеннаслужачых і прызыўнікоў. Умацоўваліся такія калгасы з цяжкасцямі, але практыка дапамогі вайскоўцаў калгасам ва ўборцы ўраджаю прыжылася надоўга. Аднак, нягледзячы на працяг палітыкі калектывізацыі, у ЛКСМБ зноў праявілася імкненне да падтрымкі ў першую чаргу аднаасобных гаспадарак. І толькі пад ціскам ЦК ВЛКСМ камсамол рэспублікі пачаў аддаваць прыярытэт працы ў калгасах [2, л. 40].

На пачатак 1931 г. у калгасах БССР налічвалася каля 300 тыс. юнакоў і дзяўчат. Прыкладна 85% вясковых камсамольцаў (каля 50 тыс. чалавек) былі ахоплены калгасамі [3, л. 18, 274, 290; 4, л. 47]. Але гэта складала толькі каля 17% ад усёй калгаснай моладзі, што гаворыць аб нешматлікасці камсамольскай праслойкі сярод яе. Увогуле ў студзені 1931 г. удзел ЛКСМБ у справаздачна-перавыбарнай кампаніі кіруючых органаў калгасаў у большасці раёнаў праходзіў слаба, таму перавыбары разгортваліся не-

своечасова [5, л. 7]. І гэта нягледзячы на тое, што ў Калгасцэнтры меліся прадстаўнікі ЦК саюза [6, л. 27–28].

У цэлым шэрагу месцаў члены камсамола слаба ўдзельнічалі ў кіраўніцтве калгасамі з пункту гледжання планавання. Недастатковай была камсамольская праца па разгортванні ў калгасах і саўгасах сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якія часта набывалі кампанейскі характар. На вёсцы налічвалася да 85% камсамольцаў-ударнікаў, але некаторыя з іх насамрэч не заслугоўвалі гэтага звання [7, л. 36]. ЛКСМБ вяла праяўляў сябе ў барацьбе з безгаспадарчасцю ў калгасах і за ўзняцце працоўнай дысцыпліны. Правядзенне паасобных гаспадарчых мерапрыемстваў слаба ўвязвалася з арганізацыяй новага прыліву ў калгасы. Шэраг РК і ячэек камсамола рэспублікі не ўзначалілі актыўнага руху бядняцка-серадняцкіх мас за калектывізацыю [2, л. 41]. Масавая кампанія па суцэльным уцягненні вясковых камсамольцаў у калгасы праводзілася зусім дрэнна [8, л. 13].

Некаторыя структуры саюза правялі паход за арганізацыю працы ў калгасах, але ён не распаўсюдзіўся на ўвесь ЛКСМБ і не стаў сапраўды масавым. Камітэты і ячэйкі прафсаюзаў і кампартыі недастаткова дапамагалі ў правядзенні гэтага паходу [9, л. 142], што яўна сведчыць аб няўзгодненасці падобнай працы з імі. Хаця к маю 1931 г. шэраг арганізацый камсамола БССР дасягнулі значных поспехаў у барацьбе за намечаныя тэмпы калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, агульны ўдзел саюза ў калектывізацыі лічыўся нездавальняючым. Шэраг РК ЛКСМБ не ўвязвалі сваю штодзённую дзейнасць з выкананнем задач па ўзняцці тэмпаў калектывізацыі [5, л. 37]. У Бабруйскім, Гомельскім, Дубровенскім і Старадарожскім раёнах камсамольскія структуры зусім бяздзейнічалі ў справе калектывізацыі [8, л. 67].

Асобныя арганізацыі камсамола рэспублікі не забяспечылі паспяховага выканання рашэнняў пленума ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі 30% бедняцка-серадняцкіх гаспадарак у час сяўбы (гэта датычылася памежных раёнаў, а таксама Бабруйскага, Барысаўскага, Гарадоцкага, Гомельскага, Лельчыцкага, Рэчыцкага РК саюза) [5, л. 102].

Усё вышэйзгаданае яскрава сведчыць пра адсутнасць ў ЛКСМБ рэальнай зацікаўленасці ў арганізацыі калгаснай працы. Больш таго, можна нават гаварыць аб пашыранасці ў камсамоле БССР правых настрояў і ўплываў праціўнікаў калектывізацыі. Відавочна таксама слабая ўзгодненасць яго дзеянняў з кампартыяй і прафсаюзамі.

Толькі ў чэрвені 1931 г. пачаўся пэўны пералом сітуацыі ў іншы бок. ЦК і РК ЛКСМБ аператыўна ўключыліся ў двухтыднёвы паход за ўлік працы ў калгасах, мабілізавалі каля 5 тыс. камсамольцаў, сіламі якіх ажыццяўляўся ўлік у 3 600 калгасах. Было заведзена звыш 1 тыс. працоўных кніжак, створана станоўчая грамадская думка наконт пастаўленых паходам задач. Аднак Асіповіцкі, Гарадоцкі, Камарынскі, Капыльскі, Клічаўскі, Крычаўскі, Расонскі і Сенненскі РК камсамола фармальна аднесліся да яго правядзення, самавольна скарацілі колькасць мабілізаваных, сістэматычна не дасылалі звестак аб паходзе. Гэта выразна сведчыць аб яго фактычным сабатажы з іх боку. Таму з 6 ліпеня 1931 г. у БССР быў абвешчаны шасцідзённы рэйд груп «лёгкай кавалерыі» і юнкераўскіх брыгад для падагульнення вынікаў праведзенай саюзам працы, выяўлення і ліквідацыі недахопаў [3, л. 278–279; 5, л. 172]. Усяго ў 1931 г. ЛКСМБ вылучыў для арганізацыі ўліку працы і прадукцыі ў калгасах 8,5 тыс. камсамольцаў. Многія з іх пасля заканчэння кароткатэрміновых курсаў сталі калгаснымі рахункаводамі [10, с. 56].

Нягледзячы на шэраг добрых прыкладаў удзелу асобных камсамольскіх структур у арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, дзейнасць камсамола рэспублікі ў гэтым напрамку ў 1931 г. была яўна нездавальняючай. Вясковымі аддзеламі ЦК і РК саюза недастаткова аператыўна ажыццяўлялася кіраўніцтва і праверка працы ячэек і асобных камсамольцаў. Слаба вялася барацьба за сапраўднае ўвядзенне здзельшчыны, а таксама з дробнабуржуазнымі праявамі ў калгасах [11, л. 53]. ЛКСМБ яшчэ слаба

ўдзельнічаў у сацыялістычнай перабудове вёскі. Адсутнічала сістэматычная праца камсамольцаў з юнацтвам батракоў, беднякоў і сераднякоў па ўцягненні яго ў сацыялістычнае будаўніцтва [2, л. 40–41].

У 1931 г. у БССР па ініцыятыве камсамола рэспублікі пачалося стварэнне пры камітэтах саюза маладзёжных сельскагаспадарчых станцый. У адпаведнасці з пастановай Народнага камісарыята земляробства (НКЗ) БССР ад 16 лютага 1931 г. іх фінансаванне ажыццяўлялася з бюджэту раённых зямельных органаў. Юнацкія сельскагаспадарчыя станцыі набылі вялікае гаспадарча-палітычнае значэнне ў справе павышэння вытворчасці калектыўнага сектара, укаранення масавага вопыту рацыяналізатарства і вынаходніцтва ў сельскай гаспадарцы. Сетку гэтых станцый, якія падначальваліся Беларускай сельскагаспадарчай станцыі моладзі (БССМ) пры ЦК ЛКСМБ (пачала практычную працу з 17 красавіка), камсамол рэспублікі выкарыстоўваў для арганізацыі практычнага ўдзелу юнакоў і дзяўчат калгасаў і саўгасаў у калгасна-саўгасным будаўніцтве. Станцыі з’яўляліся цэнтрамі вопытнай метадычнай базы саюза. Для штодзённай практычнай працы маладзёжных сельскагаспадарчых станцый да іх прымацоўваліся спецыялісты (аграномы, ветурачы, заатэхнікі), усе станцыі мелі 3 сектары: вытворчы, гарадскі і масавай працы [12, л. 181; 13, л. 146, 355–356, 359; 14, л. 23–25].

БССМ з’яўлялася метадычнай базай сельскагаспадарчага сектара ЦК ЛКСМБ, працавала непасрэдна пад яго кіраўніцтвам па планах, зацверджаных НКЗ БССР. Станцыю узначальваў загадчык. Яна магла атрымоўваць дадатковыя фінансавыя сродкі ад зацікаўленых гаспадарчых устаноў і кааперацыйных аб’яднанняў [15, л. 40–41]. Аднак у маі 1931 г. яе кіраўніцтва яшчэ не спраўлялася з пастаўленымі задачамі: адсутнічалі абагульненне вопыту ўдарніцтва і спаборніцтва ў калгасах і саўгасах, дапамога раённым арганізацыям у распаўсюджванні вопыту, станоўчая грамадская думка вакол працы станцый, выкарыстанне навуковых напрацовак [6, л. 86].

На верасень 1931 г. у рэспубліцы налічвалася толькі 10 юнацкіх сельскагаспадарчых станцый пры РК камсамола [15, л. 253]. Нягледзячы на складанае ўласнае ўнутранае становішча, ЛКСМБ удзельнічаў у правядзенні пасяўных і ўборачных кампаній [3, л. 290]. У красавіку 1931 г., зыходзячы з рашэнняў ЦК КП(б)Б аб забароне рэспубліканскіх нарад, звязаных з выклікам раённых працаўнікоў, усім аддзелам ЦК камсамола БССР было забаронена выклікаць на розныя нарады прадстаўнікоў РК саюза да заканчэння вясновай пасяўной кампаніі [15, л. 76]. Аднак ЛКСМБ нездавальняюча мабілізоўваў сваіх членаў і працоўнае юнацтва на падрыхтоўку і правядзенне вясновай пасяўной кампаніі [5, л. 37; 8, л. 67]. Бюро ЦК камсамола рэспублікі нават скараціла мабілізацыю камсамольцаў на пасяўную кампанію з 300 да 200 чалавек [5, л. 69]. Гэта яшчэ раз падкрэслівае складанае ўнутранае становішча ў саюзе.

ЛКСМБ таксама недастаткова ўвязваў задачу спецыялізацыі сельскай гаспадаркі з правядзеннем вясновай сяўбы. Праведзены ім месячнік па падрыхтоўцы да сяўбы не перарос у сістэматычную працу па яе правядзенні [5, л. 102]. Шэраг РК камсамола рэспублікі слаба мабілізоўвалі масы на рашучую барацьбу з правай практыкай у гэтым пытанні. Так, Бабруйскі, Гомельскі, Дубровенскі і Старадарожскі РК саюза не ўвязвалі падрыхтоўку да вясновай сяўбы з новым калгасным прылівам [5, л. 18]. ЛКСМБ нездавальняюча рэалізоўваў заклік ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі яравых пасеваў [5, л. 39] і зусім слаба працаваў у галіне выканання планаў кантрактацыі [6, л. 43].

У маі 1931 г. камсамол БССР дрэнна ўдзельнічаў у кампаніі нарыхтоўкі кармоў і стварэння фуражнага фонду. Арганізацыі саюза недаацэньвалі яе важнасці. Шэрагам іх не быў падтрыманы паход ЛКСМБ за сілас [16, л. 92]. З канца мая камсамол рэспублікі ўключыўся ва ўсесаюзную камсамольскую ахову ўраджаю і правядзенне ўборчай кампаніі [5, л. 146]. Усяго ў 1931 г. у ёй ў БССР удзельнічалі каля 15 тыс. камсамольцаў [17, л. 67]. У верасні ЛКСМБ не мабілізаваўся на нарыхтоўку садавіны і гародніны. Ра-

шэнне ЦК УЛКСМ аб удзеле камсамола ва ўборцы і нарыхтоўцы садавіны і гародніны ад 8 жніўня 1931 г. да мас камсамольцаў рэспублікі не было даведзена. Камітэты і ячэйкі ЛКСМБ зусім нездавальняюча ўдзельнічалі ва ўборцы, нарыхтоўцы і перапрацоўцы садавіны і гародніны. Сельскагаспадарчы сектар ЦК камсамола БССР цалкам бяздзейнічаў. Газета «Чырвоная зьмена» зусім слаба асвятляла гэту кампанію [18, л. 84].

ЛКСМБ удзельнічаў і ў хлебанарыхтоўках пад лозунгам «Ні аднаго цэнтнера хлеба прыватніку!» ЦК камсамола рэспублікі мабілізаваў камсамольцаў у сістэму Хлебжывёлаводсаюза і Трактарцэнтра ў якасці ўзважвальшчыкаў, прыёмшчыкаў і нарыхтоўшчыкаў. Для дапамогі раённым арганізацыям і кіраўніцтва ходам нарыхтоўчай кампаніі ў шэраг раёнаў БССР была накіравана група з цэнтральнага камсамольскага актыву. Аднак слаба разгортвалася масавая арганізацыйная праца сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарак. Недастаткова рабіўся націск на заможную частку вёскі [19, л. 2]. Такое становішча можна растлумачыць пашыранасцю ў ЛКСМБ правых настрояў.

Нягледзячы на тое, што ўдзел камсамола БССР у нарыхтоўцы і адгрузцы бульбы для прамысловых цэнтраў Савецкага Саюза разгортваўся марудна [20, л. 117], усяго сіламі ЛКСМБ было адгружана 25 эшалонаў бульбы Ленінграду і 18 эшалонаў бульбы Маскве. Асобныя камсамольскія арганізацыі рэспублікі былі прэміраваны пастановай Народнага камісарыята забеспячэння СССР за актыўны ўдзел у нарыхтоўцы і адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам Савецкага Саюза [17, л. 49; 19, л. 3].

Разам з тым выкананне плана ільнонарыхтовак знаходзілася ў нездавальняючым стане. Хаця камсамол БССР актыўна ўключыўся ў правядзенне месячніка апрацоўкі і нарыхтоўкі лёну (пасылка 135 камсамольцаў-актывістаў на дапамогу раённым арганізацыям, абвяшчэнне двухтыднёвіка штурму, выклік на сакратарыят ЦК з дакладамі сакратароў шэрагу РК і г.д.), частка РК саюза пусцілі справу на самацёк, не вялі масавую працу, недаабкладалі заможных сялян цвёрдымі заданнямі, лічылі планы ільнонарыхтовак нерэальнымі і самавольна скарачалі іх [15, л. 63]. Зноў бачым яўнае сведчанне пашыранасці правых настрояў у ЛКСМБ.

ЦК і РК камсамола БССР у апошнія дэкады красавіка 1931 г. па сутнасці зусім спынілі працу па нарошчванні тэмпаў нарыхтоўкі лёну. Рэспубліка па-ранейшаму заставалася на апошнім месцы ў СССР па выкананні планаў ільнонарыхтовак. У Смалявіцкім, Слуцкім, Каралінскім, Свіслацкім, Церахаўскім і інш. раёнах камсамольскія РК увогуле нават не пачыналі займацца ільнонарыхтоўкамі. ЦК саюза недастаткова кіраваў падначаленымі РК у справе льнонарыхтовак і слаба правяраў выкананне дырэктыў як уласных, так і партыйна-савецкіх органаў, што гаворыць аб разбалансаванасці кіраўнічага механізму ў ЛКСМБ. У выніку не было забяспечана поўнае і своечасовае выкананне плана льнонарыхтовак [21].

На складаную сітуацыю з удзелам камсамола БССР у льнонарыхтоўках звярнула ўвагу нават «Комсомольская правда». У сакавіку 1931 г. у Дрысенскім раёне працавала выязная рэдакцыя гэтай газеты, якая разам з РК ЛКСМБ выдала 3 нумары (кожны тыражом у 3 тыс. экзэмпляраў) лістка-газеты «За разьвіццё ільну!» [13, л. 314–318]. А ў красавіку з'явіліся публікацыі аб праблемах удзелу камсамольцаў рэспублікі ў льнонарыхтоўках і ў самой «Комсомольской правде» [5, л. 87; 15, л. 101]. У жніўні 1931 г. была абвешчана мабілізацыя 300 членаў камсамола БССР для ўборкі лёну ў саўгасах [20, л. 25–26]. Але жаданых вынікаў гэта не прынесла.

ЛКСМБ слаба ўдзельнічаў не толькі ў нарыхтоўцы, але і ў першапачатковай апрацоўцы ільна і канапель. Так, на лістапад 1931 г. план па мяцці быў выкананы на 11,3%, па трапанні – на 3,8%; ільнянога валакна было нарыхтавана 7,8%, пянькі – 0,9%, семя лёну – 44,9%, семя канапель – 8,8%. Асабліва адставалі ў гэтай працы Асвейскі, Бешанковіцкі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Крупскі, Мсціслаўскі, Сіроцінскі, Ушац-

кі РК камсамола. РК і ячэйкі саюза дрэнна забяспечвалі правільную арганізацыю адпаведнай працы ў калгасах (расстаноўка сіл, сапраўднае ўвядзенне здзельшчыны і г.д.), не разгарнулі належнай масавай працы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў з ліку беднякоў і серадмякоў па своечасовай апрацоўкі лёну і канапель, здачы іх дзяржаве (семя і валакно), а таксама сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва [22, л. 159]. Увогуле Асвейскі, Гарадоцкі, Горацкі, Дубровенскі, Крупскі, Полацкі, Талочынскі, Чавускі РК ЛКСМБ не забяспечылі належны ход ільнонарыхтоўчай кампаніі, бо не вялі адпаведнай растлумачальнай працы сярод камсамольцаў і сялянства, недаацэньвалі важнасці выканання льнонарыхтоўчых планаў [23, л. 35]. У выніку камсамолам рэспублікі была сарвана арганізацыя ўсебеларускага льноабозу да XIV з’езда КП(б)Б [24, л. 12].

У 1931 г. дзейнічаў дагавор ЦК ЛКСМБ і Беларускага цэнтральнага жывёлагадоўчага саюза аб узаемадзеянні ў рамках камсамольскага калгасна-вытворчага паходу ў галіне развіцця жывёлагадоўлі, а таксама ў справе дапамогі жывёлагадоўчай кааператыўнай сістэме БССР у выкананні планавых заданняў па аднаўленні і арганізацыі першапачатковых вытворчых таварыстваў [13, л. 131–132]. Аднак камсамол рэспублікі слаба ўдзельнічаў у вырашэнні жывёлагадоўчай праблемы. Так, асобныя РК і ячэйкі ЛКСМБ цалкам правалілі свінагадоўчую эстафету, якую праводзіў саюз [9, л. 157–158]. Нягледзячы на катэгарычную пастанову ЦК камсамола БССР аб мабілізацыі 2 тыс. камсамольцаў у саўгасы Свінаводтрэсту, прынятую 25 сакавіка 1931 г. [15, л. 113], адпаведная развёрстка РК саюза ў красавіку 1931 г. не была выканана. Шэраг РК ЛКСМБ (Дрысенскі, Свіслацкі і інш.) лічылі гэту мабілізацыю немагчымай, а Мазырскі і Слуцкі РК камсамола нават адмовіліся яе выконваць [6, л. 56]. У сувязі з гэтым Сакратарыят ЦК ЛКСМБ 22 мая 1931 г. вымушаны быў нават абвясціць двухтыднёвік ліквідацыі камсамольскіх хібаў у саўгасах Свінаводтрэста [15, л. 117].

Рэдакцыя «Чырвонай зьмены» з 1 ліпеня да 15 верасня 1931 г. не разгарнула шырокай агітацыйнай працы па мабілізацыі саюза на выкананне рашэнняў кампартыі аб развіцці свінагадоўлі, па рэалізацыі закліку «Комсомольской правды» да барацьбы за тону мяса з апаросу ў шасцімесячным узросце. Толькі ў другой палове верасня былі прадпрыняты канкрэтныя захады, каб выправіць гэту сітуацыю [25, с. 2], а з кастрычніка ў штаб па свінагадоўлі пры «Комсомольской правде» быў уведзены прадстаўнік ЦК камсамола БССР [15, л. 303].

Хоць прадстаўнік ЦК ЛКСМБ у 1931 г. і ўваходзіў у штаб па правядзенні месячніка рэалізацыі сельскагаспадарчых машын [13, л. 217], саюз яшчэ слаба ўдзельнічаў у вырашэнні праблемы спецыялізацыі і масавай падрыхтоўкі кадраў для сельскай гаспадаркі, машынізацыі і меліярацыі. Камсамольцы, у першую чаргу актыў, нездавальняюча авалодвалі сельскагаспадарчай тэхнікай [2, л. 37]. Аднак камсамол рэспублікі мэтанакіравана павялічваў увагу да падрыхтоўкі кадраў для МТС. Толькі з чэрвеня 1930 г. па снежань 1931 г. на працу туды было накіравана 638 яго членаў. З іх і іншай моладзі былі падрыхтаваны сотні трактарыстаў. Так, ў БССР у 1930 г. толькі 12 камсамольцаў умелі вадзіць трактары, у 1933 г. – 630, а ў 1934 г. – 850 [26, с. 173–174, 198].

У сувязі з пастановай ЦК ВКП(б), СНК і НКЗ СССР аб жывёлагадоўлі па лініі ЦК ЛКСМБ у красавіку 1932 г. былі створаны і пасланы на месцы брыгады для разгортвання працы ў гэтым кірунку [13, л. 88]. Але многія РК камсамола рэспублікі не зрабілі адпаведных высноў з пастаноў кампартыі і ўрада [27, л. 13]. Так, у большасці арганізацый саюза не вялося належнай барацьбы з недахопамі ў свінагадоўлі. Масы не былі мабілізаваны пад лозунгам «Даць тону – апарос!». Бяздзейнічалі камсамольскія брыгады і свінарнікі [24, л. 33]. Разам з тым палепшылася праца ячэек ЛКСМБ і асобных камсамольцаў у рамках «шэфства над канём». Была разгорнута, у тым ліку праз друк, масавая растлумачальная праца ў гэтым кірунку як унутры камсамола, так і сярод значнай часткі вясковага насельніцтва. Члены саюза вялі вялікую арганізацыйную і растлума-

чальную працу сярод конюхаў, накіраваную на актывізацыю іх удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, паляпшэнне прафесійнай падрыхтоўкі конюхаў і арганізацыю перадачы лепшага вопыту, канцэнтраванне ўвагі ўсёй грамадскасці на справе паляпшэння конегадоўлі. Адбыўся ўсебеларускі маладзёжны рэйд па праверцы конюхаў і стану стайняў. На працу ў апошніх масава вылучаліся камсамольцы-ўдарнікі. Праводзіліся злёты конюхаў. У чэрвені 1932 г. па ўсёй БССР адзіны камсамольскі дзень быў прысвечаны выключна пытанням стану конскага пагалоўя і ўдзелу ячэек ЛКСМБ у ажыццяўленні задач «шэфства над канём». Камсамол рэспублікі аказваў канкрэтную дапамогу ў развіцці конегадоўлі. За рэдкім выключэннем камсамольцы-конюхі мелі лепшыя паказчыкі ў працы. Шэраг мясцовых камсамольскіх ячэек цалкам узялі ў свае рукі догляд коней [27, л. 10–11, 15, 17]. Аднак ЛКСМБ марудна ўключаўся ў рэалізацыю пастаноў аб удзеле ў падрыхтоўцы і правядзенні вясновай пасяўной кампаніі 1932 г. [23, л. 29]. Спачатку для яе ажыццяўлення былі мабілізаваны толькі 150 членаў саюза [13, л. 126].

Адначасова камсамол БССР імкнуўся пашыраць і калгасную працу. Так, у маі для ўмацавання калгасаў памежных раёнаў былі мабілізаваны 200 камсамольцаў з не менш чым трохгадовым стажам з ліку кандыдатаў і членаў КП(б)Б, а таксама яшчэ 150 са стажам не менш 2-х гадоў, прычым з іх – 10 чалавек палякаў [23, л. 114], што, зразумела, тлумачыцца памежжам з Польшчай. Але ЛКСМБ па-ранейшаму адставаў ад планавых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы. Хоць у выніку паходу за ўраджай і калектывізацыю ўзрасла творчасць мас юнацтва, значна вырас працэнт членаў камсамола ў калгасах і г.д., саюзам недастаткова было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва па калектывізацыі паміж АК, РК і ячэйкамі, нешырока выкарыстоўвалася ініцыятыва і самадзейнасць камсамольцаў, маладых парабкаў і беднякоў. Пытанне аб рабоце сярод юнакоў і дзяўчат з ліку беднага сялянства ў гэты час амаль зусім не стаяла на парадку дня ў ЛКСМБ. Праца сярод дзяўчат увогуле ішла вельмі дрэнна. Калектывізацыя яшчэ не стала асноўнай мэтай дзейнасці камсамола рэспублікі на вёсцы. Значная колькасць яго арганізацый абмяжоўвалася правядзеннем толькі агракультурных мерапрыемстваў. У часткі членаў саюза ярка праяўляліся правыя ўплывы (выступленні супраць праводзімых кампартыяй мерапрыемстваў па калектывізацыі, абарона заможных сялян і імкненне ўцягнуць іх у калгасы, антыкалгасныя настроі). Працягвалі адзначацца сотні выпадкаў збягання камсамольцаў ад калектывізацыі ў гарады. У некаторых гарадскіх ячэйках ЛКСМБ па-ранейшаму глядзелі на пасылку ў калгасы як на нейкую кару. Для правядзення чарговай мабілізацыі членаў камсамола БССР у калгасы ў канцы 1932 г. давялося ствараць нават спецыяльную камісію ЦК КП(б)Б [13, л. 89, 351–353]. Ячэйкі саюза адыгрывалі слабую ролю ў калгаснай вытворчасці [28, л. 71].

Аднак праявы актыўнасці ў ЛКСМБ не згасалі. Па ініцыятыве Мсціслаўскіх камсамольцаў з 20 ліпеня па 20 жніўня 1932 г. у рэспубліцы прайшоў месячнік камсамольскага штурму па ўборцы ўраджаю. Члены камсамола арганізоўвалі «чырвоныя абозы» для своечасовага вывазу збожжа. У выніку моладзь дапамагла калгасам і саўгасам без страт сабраць увесь ураджай збожжавых [29, с. 74; 30, с. 1].

Са студзеня 1933 г. ЦК ЛКСМБ разгарнуў агразаатэхпаход камсамольцаў і сельскага юнацтва з мэтай павышэння агратэхнічнага і заатэхнічнага ўзроўню падрыхтоўкі маладых калгаснікаў і рабочых саўгасаў. Ствараліся агразаатэхнічныя гурткі, вучобай у якіх былі ахоплены звыш 28 тыс. юнакоў і дзяўчат [26, с. 201–202]. Акрамя таго, пры «Чырвонай зьмене» 18 студзеня 1933 г. быў створаны штаб для кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам у саўгасах [31, л. 10], што сведчыць аб прыярытэтнасці для камсамола разгортвання гэтай працы менавіта ў іх. Таксама ЦК ЛКСМБ прыняў рашэнне аб мабілізацыі ў калгасы для ўмацавання іх пралетарскімі кадрамі 617 членаў камсамола: Бабруйск – 50, Барысаў – 30, Віцебск – 145, Гомель – 140, Жлобін – 12, Магілёў –

75, Мінск – 115, Орша – 50 [32, л. 14]. Як бачым, 65% мабілізаваных прыпадала на Віцебск, Гомель і Мінск, што зразумела, бо яны з'яўляліся найбольшымі прамысловымі цэнтрамі рэспублікі.

Народны камісарыят працы БССР 27 лютага 1933 г. пастанавіў вызваліць ад працы на прадпрыемствах і ва ўстановах рабочых і служачых, мабілізаваных у калгасы камсамольцаў, з выплатай фактычнага заробку і двухтыднёвай зарплаты як выхадной дапамогі, захаваннем за імі сярэдняга заробку на час 5-дзённых курсаў. У сакавіку 1933 г. мабілізаваным у калгасы членам ЛКСМБ былі выдадзены чаравікі, пара бялізны, аднаразовы паёк, грошы на праезд, выхадная двухтыднёвая дапамога і аплата за 5-дзённыя курсы. ЦК камсамола рэспублікі былі дадзены ўказанні аб залічэнні іх у калгасы, забеспячэнні жыллём і выдачы ім харчавання за лік будучых працадзён. Але мабілізацыя не заўжды праходзіла гладка, некаторыя камсамольцы адмаўляліся. Гомельскі і Бабруйскі АК саюза ў зададзены тэрмін не выканалі развёрстку па мабілізацыі. На месцах не ўсюды былі падрыхтаваны да прыняцця мабілізаваных [32, л. 13, 27–34; 33, л. 36].

Бюро ЦК ЛКСМБ 4 ліпеня 1933 г. прыняло пастанову аб прымацаванні 26 сваіх членаў для штодзённай сувязі і аператыўнай дапамогі ў практычнай рабоце мабілізаваным у калгасы камсамольцам, бо практыка прымацавання для сувязі з імі пазаштатных інструктараў інфармацыйнага сектара з ліку студэнтаў сябе не апраўдала [33, л. 217, 219], што сведчыць аб першапачатковай недаацэнцы складанага характару гэтай працы. Аднак многія члены сельскіх камсамольскіх арганізацый не прымалі непасрэднага ўдзелу ў калгаснай вытворчасці, ухіляліся ад фізічнай працы [10, с. 57].

З надыходам вясны 11 членаў Бюро і работнікаў ЦК камсамола БССР былі накіраваны ў раёны для арганізацыі пасяўной кампаніі [33, л. 38]. Пастановай Бюро ЦК ЛКСМБ і калегіі НКЗ рэспублікі ад 3 красавіка 1933 г. была ўхвалена ініцыятыва Мінскага ГК камсамола і рэдакцыі газеты «Чырвоная зьмена» аб правядзенні ў перыяд вясновай пасяўной кампаніі конкурсу-спаборніцтва на лепшага трактарыста. Былі ўстаноўлены 80 прэмій на суму 50 тыс. руб. для пераможцаў. Першая ўключала для лепшых трактарыстаў веласіпеды (5 прэмій) і 3 прэміі па 400 рублёў; для лепшых брыгадзіраў паездкі на курорт (3 прэміі) і 2 прэміі па 600 руб.; для лепшых МТС і саўгасаў 2 прэміі па 4 тыс. руб. для правядзення культурна-масавай работы. Другая ўключала для лепшых трактарыстаў гармонікі (10 прэмій) і 5 прэмій па 200 руб.; для лепшых брыгадзіраў вытворчыя экскурсіі ў Маскву, Ленінград і Харкаў (8 прэмій) і 5 прэмій па 300 руб.; для лепшых МТС і саўгасаў 2 прэміі па 2 тыс. руб. Трэцяя ўключала для лепшых трактарыстаў касцюмы (10 прэмій), 10 прэмій па 150 руб., тэхнічныя і ленінскія бібліятэчкі (10 прэмій); для лепшых брыгадзіраў – гармонікі (8 прэмій), 4 прэміі па 200 руб., тэхнічныя і ленінскія бібліятэчкі (5 прэмій). Акрамя гэтага прадугледжваліся за ўзорную арганізацыю конкурсаў 2 прэміі для цэнтральных рэспубліканскіх газет па 3 тыс. руб., 5 прэмій па 1 тыс. руб. для раённых газет, 3 прэміі па 300 руб. для шматтыражак МТС і саўгасаў, 10 прэмій па 100 руб. для брыгадных штодзёнак, 3 прэміі па 1 тыс. руб. для РК саюза [33, л. 75, 78–79]. Аднак штаб, створаны пры ЦК ЛКСМБ, не прыняў мер па сувязі з раённымі арганізацыямі для ажыццяўлення конкурсу на лепшага трактарыста, а «Чырвоная зьмена» надала недастаткова ўвагі гэтаму конкурсу [33, л. 84–85], што адмоўна паўплывала на якасць яго правядзення. Гэта зноў сведчыць аб разбалансаванасці сістэмы кіравання ўнутры камсамола БССР.

Пастановай ЦК ЛКСМБ з 20 па 25 мая 1933 г. была абвешчана ўдарная камсамольская пяцідзёнка сяўбы, бо на 10 мая было засеяна толькі 27,8% плошчаў. Але ў справе падрыхтоўкі пяцідзёнкі недапушчальна марудзілі Бабруйскі, Дзяржынскі, Дубровенскі, Крупскі, Смалявіцкі і Уздзенскі РК камсамола. Значная колькасць РК саюза зусім неаператыўна кіравала адпаведнай працай падначаленых ячэек. У выніку пяцідзёнка была правалена. Толькі 9 камсамольскіх РК (Барысаўскі, Жыткавіцкі, Лельчыцкі,

Парыцкі, Рагачоўскі, Слуцкі, Старобінскі, Тураўскі, Чырвонаслабодскі) нефармальна аднесліся да яе правядзення [33, л. 123, 128, 135]. Як бачым, нягледзячы на шматлікія недахопы ў дзейнасці ЛКСМБ, улады яшчэ разглядалі яго як дзейсны сродак у справе якаснага правядзення пасяўной кампаніі. Аднак гэты давер не быў апраўданы, што з'яўляецца пацвярджэннем глыбокага ўнутранага крызісу камсамола рэспублікі, адсутнасці ў яго ЦК і РК якаснай сістэмы кіравання.

Таксама ЛКСМБ недастаткова ўдзельнічаў у выкананні плана нарыхтоўкі бульбы для Харкаўскай вобласці УССР, асабліва Бабруйскі, Веткаўскі, Крупскі, Магілёўскі, Пухавіцкі, Хойніцкі і Чавускі РК камсамола, якія не разумелі значнасці гэтага мерапрыемства [33, л. 65]. Нездавальняючымі былі вынікі працы ЛКСМБ і ў рамках «шэфства над канём». РК камсамола БССР не дапамагалі ячэйкам і конюхам у правядзенні мерапрыемстваў па конегадоўлі [33, л. 145]. Разам з тым у 1933 г. ЛКСМБ узяў шэфства над сельскагаспадарчымі машынамі рэспублікі. У цэнтральных установах і арганізацыях, а таксама раённых цэнтрах 7–27 чэрвеня быў праведзены «чырвонаармейскі» рэйд юных карэспандэнтаў і «лёгкіх кавалерыстаў» з мэтай праверкі стану падрыхтоўкі кадраў, рамонту і размеркавання сельскагаспадарчых машын. У выніку быў выкрыты шэраг недахопаў [27, л. 71], у тым ліку нездавальняючае распаўсюджанне камсамольцамі на вёсцы агратэхнічнай літаратуры [31, л. 11].

Па выніках рэйду камсамол БССР мабілізаваў 95 слесараў і токараў з ліку сваіх членаў на сталую працу ў машынна-трактарныя майстэрні (МТМ), саўгасы і МТС. Яшчэ 9 камсамольцаў-выпускнікоў школ ФЗН былі мабілізаваны на сталую працу рабочымі МТС тэрмінам не менш 2 гадоў [31, л. 66]. Але некаторыя дырэктары МТМ і МТС не прымалі мабілізаваных з-за адсутнасці патрэбы ў іх. У большасці МТМ мабілізаваным не давалі жылля, дрэнна кармілі, выкарыстоўвалі не па профілі і г.д. [27, л. 122]. Такое становішча гаворыць аб непрадуманасці і паспешлівасці правядзення мабілізацыі, адсутнасці паўнавартаснага ўліку патрэб у запаўненні вакансій. Акрамя таго, у палітаддзелы МТС былі мабілізаваны 56 членаў ЛКСМБ, але з іх толькі 47 выехалі на месца працы ў тэрмін [31, л. 45], што зноў сведчыць аб непадрыхтаванасці належным чынам і гэтай мабілізацыі. Усяго ў МТС рэспублікі дзейнічалі 1 616 партыйна-камсамольскіх груп [34, с. 190]. У калгасах з зон адказнасці МТС таксама ствараліся камсамольскія групы [35, с. 2]. Гэта, несумненна, гаворыць аб паступовым пашырэнні ўплыву камсамола ў дадзеным сектары сельскагаспадарчай вытворчасці БССР нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці. Не спынялася і ўцягванне дзяўчат у працу з сельскагаспадарчай тэхнікай. Так, к канцу 1933 г. у рэспубліцы налічвалася 249 дзяўчат-трактарыстак [26, с. 203].

Актывізавала сваю дзейнасць БССМ пры ЦК ЛКСМБ, якая 18 красавіка 1933 г. была пераведзена ў памяшканне Дома тэхнікі ў Мінску [33, л. 84, 86]. Аднак на месцах не ўсюды разгортванне працы юнацкіх сельскагаспадарчых станцый было арганізавана належным чынам. Так, нягледзячы на ўказанні ЦК як саюзнага, так і рэспубліканскага камсамола, Дзяржынскі, Клімавіцкі і Лёзненскі РК ЛКСМБ зрывалі працу станцый. У шэрагу РК камсамола не жадалі вылучаць туды лепшых актывістаў, а ў асобных камсамольскіх РК работнікаў станцый не выкарыстоўвалі па прызначэнні і ператваралі іх у інструктараў [36, л. 60]. Разам з тым у льнаводчых раёнах рэспублікі ўсё яшчэ недаацэньвалі льноцерабілку «Камсамолка», а РК ЛКСМБ не арганізавалі працы па выкананні плана выкарыстання ільноцерабілак. З-за гэтага БССР адставала ў спаборніцтве з Заходняй вобласцю [31, л. 165].

Нягледзячы на недахопы, улады працягвалі рабіць стаўку на камсамол у сельскагаспадарчых кампаніях. ЛКСМБ быў абвешчаны шэфам насеннага фонду і з 26 студзеня па 10 лютага 1934 г. правёў усебеларускі камсамольскі рэйд ачысткі насення і праверкі яго захавання [37, л. 6–7]. Таксама у сувязі з тым, што ў рэспубліцы незда-

вальняюча ішла нарыхтоўка бульбы для прамысловых цэнтраў СССР, было вырашана падключыць да гэтай справы РК і ячэйкі камсамола [36, л. 31].

У 1934 г. для ўмацавання калгасаў памежных раёнаў было мабілізавана 150 членаў ЛКСМБ [38, л. 140]. Яшчэ 216 камсамольцаў пасля заканчэння 6-месячных курсаў па падрыхтоўцы тэхнікаў-жывёлаводаў былі мабілізаваны на працу па жывёлагадоўлі [37, л. 81, 83]. Але НКЗ БССР вельмі марудна распрацоўваў нарматыўныя матэрыялы аб выкарыстанні мабілізаваных, што зрывала іх прыём на месцах [37, л. 1, 3, 30–31]. Гэта выразна сведчыць аб няўзгодненасці дзеянняў камсамола і наркамата.

У МТС і калгасах члены ЛКСМБ вылучаліся на важнейшыя ўчасткі вытворчасці. У 1934 г. 172 камсамольцы працавалі старшынямі калгасаў, 420 – брыгадзірамі, 1 270 – на ўборачных машынах [39, с. 107–108]. ЦК ЛКСМБ і «Чырвонай зьменай» нават было арганізавана ўсебеларускае спаборніцтва маладых брыгадзіраў і старшынь калгасаў [40, л. 155].

У 1934 г. камсамол рэспублікі, нягледзячы на спаборніцтва з калегамі з Ленінградскай і Заходняй абласцей па своечасовым і якасным выкананні рамонту трактароў, нездавальняюча ўдзельнічаў у гэтай справе. Стан рамонту трактароў быў вельмі дрэнны, бо РК ЛКСМБ абмяжоўваліся пасылкай брыгад для дапамогі камсамольскім ячэйкам МТС і не кантралявалі іх дзейнасць [37, л. 32, 40].

У 1-й палове 1934 г. у БССР востра стаяла пытанне аб аднаўленні конскага пагалоўя, асабліва аб стопрацэнтным пакрыцці конематак, годных да расплоду. Гэта датычылася і камсамола рэспублікі ў рамках «шэфства над канём». Але некаторыя РК ЛКСМБ (Ветка, Гомель, Жлобін, Крычаў, Лельчыцы, Петрыкаў, Пухавічы, Тураў, Церахава) гэтым пытаннем зусім не цікавіліся і таму адставалі ў выкананні планавых задач [41, л. 154]. Шэраг РК камсамола рэспублікі бяздзейнічалі ў справе сіласавання, хаця ён і з’яўляўся «шэфам сіласа» [41, л. 160–161].

Цэлыя групы камсамольцаў правяралі падрыхтаванасць калгасаў і саўгасаў да ўборкі ўраджаю і ахоўвалі яго [40, л. 156]. Аднак, нягледзячы на набліжэнне ўборкі, у шэрагу РК ЛКСМБ не была разгорнута праца па падрыхтоўцы да яе і да аховы ўраджаю. Толькі ў Дзяржынскім, Рагачоўскім, Слуцкім і Хойніцкім раёнах былі арганізаваны камсамольска-маладзёжныя дружыны па ахове ўраджаю і збудаваны вышкі на палях [41, л. 156].

Прадстаўнік ЦК камсамола БССР 22 мая 1934 г. увайшоў у склад рэспубліканскай камісіі Усесаюзнага конкурсу імя XVII партз’езда на лепшае правядзенне хлебанарыхтоўчай кампаніі і бульбапаставак [38, л. 158].

У выніку ў жніўні 1934 г. у рэспубліцы разгарнулася спаборніцтва камсамольцаў, маладых брыгадзіраў і старшынь калгасаў, што выклікала іх вялікую актыўнасць у справе своечасовай і дабраякаснай уборкі і здачы хлеба дзяржаве. Але Веткаўскі, Жыткавіцкі, Мазырскі, Мсціслаўскі, Суражскі і Ушацкі РК ЛКСМБ зусім не кіравалі гэтым спаборніцтвам [37, л. 193]. Тым не менш к 5 верасня 1934 г. у БССР быў датэрмінова выкананы гадавы план хлебанарыхтовак, у чым камсамол адыграў вялікую ролю. У многіх раёнах, сельсаветах, калгасах і саўгасах менавіта камсамольцы былі ініцыятарамі і арганізатарамі хлебных абозаў [40, л. 154, 157]. Акрамя таго ЛКСМБ абвясціў усебеларускі конкурс на лепшае выкарыстанне льноцерабільных машын ва ўборачнай кампаніі 1934 г. Былі ўстаноўлены 50 прэмій на суму 10 тыс. руб. для лепшых ударнікаў з ліку механікаў, абслугоўваючых машыны, і трактарыстаў. Аднак у верасні пад уплывам артыкула ў «Комсомольской правде» ЦК камсамола рэспублікі вымушаны быў прызнаць, што праца па льнонарыхтоўках ажыццяўлялася камсамольцамі БССР недастаткова добра [37, л. 155, 220, 223].

Нягледзячы на ўсе хібы, у 1933–1934 гг. ЛКСМБ актыўна ўдзельнічаў у асваенні новай сельгастэхнікі і ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў [34, с. 197].

Калі ў 1933 г. з агульнага ліку членаў камсамола рэспублікі на вёсцы ў калгасах працавалі 82%, то ў 1934 г. – 90%; калі трактарыстаў-камсамольцаў у 1933 г. налічвалася 630, то ў 1934 г. – 850 [28, л. 67]. Члены ЛКСМБ дапамагалі разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва сярод калгаснікаў і механізатараў, умацоўваць працоўную дысцыпліну, ахоўваць грамадскую маёмасць. Па рашэнні ЦК камсамола БССР быў зноў праведзены камсамольскі паход з мэтай наладжвання ўліку ў сельскай гаспадарцы, у якім прынялі ўдзел каля 15 тыс. камсамольцаў. Па ініцыятыве ЛКСМБ у летне-асенні перыяд стваралiся камсамольска-юнацкія дазоры па ахове ўраджаю, у якіх былі задзейнічаны тысячы юнакоў і дзяўчат [26, с. 193–195; 28, л. 48; 33, л. 198; 42, с. 6]. Увогуле члены ЛКСМБ займалі значнае месца ў калгаснай вытворчасці і ў кіраўніцтве калгасамі рэспублікі, аказвалі вялікую дапамогу ў справе іх арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання і выканання ўсіх гаспадарчых кампаній на сяле. Пераважная большасць камсамольцаў былі перадавікамі норм выпрацоўкі [43, л. 80].

У 1934–1935 гг. сацыялістычнае спаборніцтва маладых калгаснікаў, брыгадзіраў і звеннявых ператварылася ў масавы паход юнацтва за высокі ўраджай. З ліку ўдзельнікаў спаборніцтва каля 200 чалавек для абмену вопытам выступілі на старонках «Чырвонай зьмены» [28, л. 48]. Дынаміка колькасці сельскіх камсамольцаў у калгасах БССР у першай палове 1930-х гг. вагалася: калі ў 1932 г. іх колькасць там скарацілася да менш чым 80%, то ў 1935 г. узрасла да больш чым 90% [10, с. 58].

У 1935 г. ЦК камсамола рэспублікі правёў конкурс сярод школ і курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для сельскагаспадарчых машын [44, л. 14–15]. У многім дзякуючы менавіта такім конкурсам, першымі стаханаўцамі ў сельскай гаспадарцы БССР сталі камсамольцы-льноцерабільшчыкі Горацкай МТС Д. Каравосава і А. Шустаў, якія ўстанавілі рэспубліканскі рэкорд, апрацаваўшы за сезон 86 га лёну. Як лепшыя льноцерабільшчыкі рэспублікі, яны ўдзельнічалі ва Усесаюзнай нарадзе па вырошчванні лёну ў Маскве ў студзені 1936 г. Маладая брыгадзір трактарнай брыгады Капыльскай МТС С. Рачок пры норме выпрацоўкі на трактар 250 га выканала ў 1935 г. 465 га, а ў 1936 г. – 1 500 га. Камсамолец-брыгадзір трактарнай брыгады Хоцімскай МТС Д. Ячменеў у 1935 г. выканаў выпрацоўку на адзін трактар у 706 га. У 1936 г. камсамолец-трактарыст В. Ліпень з Пухавіцкай МТС першым узараў 1 017 га і зэканоміў пры гэтым 2,6 т гаручага. Актыўны ўдзел у спаборніцтве за павелічэнне выпрацоўкі працадзён прынялі маладыя паляводы БССР. У 1937 г. першынства ў рэспубліцы заваявала камсамолка Н. Масюк з калгаса «Баявік» Грэскага раёна, якая за год напрацавала 620 працадзён [26, с. 208–209].

Значна ўзрасла удзельная вага ЛКСМБ у гаспадарчым жыцці калгасаў і вёскі ўвогуле ў 1936 г. [28, л. 67]. Вясковыя члены камсамола актыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычных пераўтварэннях сельскай гаспадаркі, стварэнні калгасаў, ахове сацыялістычнай уласнасці [28 л. 8; 45, с. 622]. Сярод трактарыстаў БССР 68% складалі камсамольцы і моладзь. Са студзеня па май 1936 г. 570 дзяўчат былі падрыхтаваны для працы на трактарах, 11 – на камбайнах, 150 – памочнікамі камбайнёраў, 90 – льноцерабільшчыцамі. Усяго ў 1936 г. спецыяльнасцю механізатара ў рэспубліцы авалодалі 2 480 дзяўчат, а дзяўчат-трактарыстак налічвалася каля 3 тыс. (каля 25% ад колькасці ўсіх трактарыстаў). Такі рост іх колькасці дазволіў ствараць пры МТС БССР жаночыя трактарныя брыгады [26, с. 203].

У саўгасах і калгасах члены ЛКСМБ таксама мелі дасягненні ў разгортванні стаханаўскага руху [28, л. 49]. На нарадзе жывёлаводаў-стаханаўцаў рэспублікі былі ўзнагароджаны 10 камсамольцаў [46, с. 6]. Але стаханаўскі рух не атрымаў яшчэ патрэбнага размаху ў калгасах і саўгасах БССР. Стаханаўцамі там былі толькі асобныя члены камсамола. ЛКСМБ не забяспечыў якаснай палітычнай, тэхнічнай і агульнаадукацыйнай вучобы стаханаўцаў [28, л. 50]. Увогуле дрэнна ішла агратэхвучоба і здача агратэхэкза-

мену камсамольцамі і юнымі калгаснікамі. Агратэхгурткі працавалі слаба [47, л. 235]. У гэты час з-пад увагі камсамола рэспублікі выпалі маладыя сяляне-аднаасобнікі. Так, РК саюза ў памежнай зоне зусім не працавалі з імі [48, л. 130]. У 1937 г. юнацтва складала дзве трэці ўсіх механізатараў БССР. К чэрвеню 1938 г. прафесіяй трактарыстаў і камбайнёраў у рэспубліцы авалодалі яшчэ 1 645 дзяўчат [26, с. 218, 240].

У 1939 г. ЛКСМБ, як і раней, аказаў вялікую дапамогу ў паспяховай арганізацыі і правядзенні сяўбы [26, с. 238–239]. З чэрвеня 1939 г. камсамол БССР прымаў актыўны ўдзел у ссяленні хутароў у вёскі. У гэтай справе ўдзельнічалі больш 35 тыс. членаў саюза, было створана 2 619 камсамольска-маладзёжных брыгад для перавозкі і ўстаноўкі жылых і гаспадарчых пабудоў сялян. Камсамольцы першымі перавозілі свае хаты. Гэта кампанія адыграла важную ролю ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў [10, с. 68; 29, с. 91; 49, с. 314]. Таксама ЛКСМБ ініцыяваў чарговую кампанію падрыхтоўкі трактарыстак з ліку дзяўчат. У выніку яшчэ каля 1,5 тыс. дзяўчат навучыліся вадзіць трактары. Сумленнай працай члены камсамола рэспублікі заваявалі вялікі аўтарытэт сярод калгаснікаў, многія камсамольцы былі выбраны на кіруючую работу ў калгасах [10, с. 67–68; 29, с. 92]. Увогуле і ў другой палове 1930-х гг. ЛКСМБ працягваў арганізоўваць калгасы і МТС, шэфстваваў над імі, вёў адпаведную агітацыю сярод сялян-аднаасобнікаў [50, с. 54].

**Заключэнне**

Такім чынам, у 1930-я гг. моладзь заставалася важнай апорай у развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці БССР, з'яўлялася непасрэдным удзельнікам мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі рэспублікі. Разам з тым у пачатку 1930-х гг. пашырэнне адмоўнага стаўлення ў грамадстве да палітыкі калектывізацыі знайшло непасрэднае адлюстраванне і ў камсамоле БССР, які ў сваёй дзейнасці на вёсцы толькі пад ціскам ЦК ВЛКСМ пачаў аддаваць прыярытэт працы ў калгасах, а не падтрымцы аднаасобных сялянскіх гаспадарак. Аднак чаканага камсамольскім кіраўніцтвам эфекту гэта не прынесла. Агульны ўдзел ЛКСМБ у калектывізацыі і арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў лічыўся нездавальняючым.

З-за пашыранасці ў камсамоле БССР правых настрояў недастаткова разгорнута было сацыялістычнае спаборніцтва па калектывізацыі паміж АК, РК і ячэйкамі, нешырока выкарыстоўвалася ініцыятыва і самадзейнасць членаў саюза, маладых парабкаў і беднякоў у справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. Значная колькасць камсамольскіх арганізацый абмяжоўвалася правядзеннем толькі агракультурных мерапрыемстваў. Няўзгодненымі былі дзеянні ЛКСМБ і кампартыі, прафсаюзаў, НКЗ БССР.

Мабілізацыі камсамольцаў у калгасы, саўгасы, МТС і МТМ праводзіліся непрадумана і паспешліва, адсутнічаў паўнавартасны ўлік патрэб у запаўненні вакансій. Улады рэспублікі працягвалі рабіць стаўку на камсамол у сельскагаспадарчых кампаніях. Але гэты давер не заўсёды апраўдваўся з-за глыбокага ўнутранага крызісу ЛКСМБ, адсутнасці ў яго ЦК і РК якаснай сістэмы кіравання.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці, уплыў камсамола ў калгасах, саўгасах, МТС і МТМ рэспублікі паступова пашыраўся, дзякуючы мэтанакіраванай палітыцы ўлад. Новай формай удзелу юнакоў і дзяўчат ва ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці стала арганізацыя па ініцыятыве ЛКСМБ пры яго камітэтах маладзёжных сельскагаспадарчых станцый. Аднак на месцах не ўсюды разгортванне іх працы было арганізавана належным чынам. З сярэдзіны 1930-х гг. камсамольцы займалі значнае месца ў калгаснай вытворчасці і ў кіраўніцтве калгасамі БССР, аказвалі вялікую дапамогу ў справе іх арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання і выканання ўсіх гаспадарчых кампаній на сяле. Аднак і напрыканцы 1930-х гг. сялянская моладзь рэспублікі не была цалкам ахоплена калгасамі. Меліся нават гаспадаркі маладых сялян-аднаасобнікаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Кривчиков, В. Тыловое обеспечение войск Красной Армии на территории Беларуси (1924–1939 гг.) // В. Кривчиков. – Гродно : ГрГМУ, 2012. – 204 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 112.
3. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 114.
4. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 580.
5. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 120.
6. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 126.
7. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 111.
8. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 131.
9. НАРБ – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 109.
10. Жураў, А. Е. Камсамол Беларусі ў барацьбе за сацыялізм // А. Е. Жураў. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1957. – 76 с.
11. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 117.
12. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 424.
13. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 493.
14. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 576.
15. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 130.
16. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 121.
17. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 538.
18. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 570.
19. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 572.
20. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 128.
21. Дайте льняное сырье. Комсомольцы Белоруссии срывают работу текстильных фабрик // Комсомольская правда. – 1931. – 27 апр. – С. 3.
22. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 122.
23. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 132.
24. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 133.
25. Чырвоная зьмена. – 1931. – 1 каст.
26. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. – Минск : Беларусь, 1975. – 536 с.
27. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 599.
28. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 139.
29. Жураў, А. Я. У баях народжаны. Кароткі нарыс гісторыі камсамола Беларусі // А. Я. Жураў. – Мінск : Народная асвета, 1970. – 224 с.
30. Чырвоная зьмена. – 1932. – 27 ліп.
31. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 135.
32. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 1050.
33. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 134.
34. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Минск : Беларусь,1967. – Ч. II. – 585 с.
35. Звязда. – 1933. – 29 верас.
36. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 609.
37. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 136.
38. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 610.
39. Партии помощник боевой. – Минск : Выд-ва АН БССР, 1968. – 287 с.
40. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 608.
41. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 611.

42. Аўгустайціс, А. В. Пад сьцягам партыі Леніна – Сталіна : справаздачны даклад ЦК на XI з'ездзе ЛКСМБ // А. В. Аўгустайціс. – Мінск : Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1936. – 33 с.
43. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 606.
44. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 137.
45. Гісторыя Беларускай ССР. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – Т. 3. – 696 с.
46. Спрэчкі па дакладу таварыша Лешчынера // Чырвоная зьмена. – 1936. – 14 сак. – С. 6–7.
47. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 140.
48. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 621.
49. Гісторыя Беларускай ССР. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1958. – Т. 2. – 664 с.
50. Макарэвіч, А. Камсамол / А. Макарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1997. – Т. 4. – С. 54–55.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.01.2016

***Danilovich V.V.*** **Young People in Agricultural Industry of the BSSR in the 1930s**

*The article deals with the problem of youth participation in agricultural production in the Soviet Belarus in the 30s. of the twentieth century. It is stated that the youth are an important pillar in the development of the agricultural production of the Byelorussian SSR, was directly involved in the modernization of agriculture of the republic. However, in the early 1930s the expansion of the negative attitude of society towards collectivization policy found a direct reflection in the Komsomol and the Byelorussian SSR. Overall its participation in the collectivization and organizational and economic strengthening of the collective farms was considered unsatisfactory. A significant number of Komsomol organizations carrying out only limited agricultural events. However, despite all the difficulties and complexity of the impact of the Young Communist League in the collective and state farms, machine and tractor stations and the workshops of the republic gradually expanded, thanks to the purposeful policy of the authorities. New form of participation of young people in improving agricultural production was the organization on the initiative of the Komsomol committee of the republic during its youth agricultural stations. However, in the late 1930s peasant youth of Byelorussian SSR were not fully involved by collective farms. The country even had farms of young individual farmers.*